УДК 331.556.4(8=6)

**В. У. Коваль**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# ЭКАНАМІЧНАЯ ЭМІГРАЦЫЯ БЕЛАРУСАЎ У БРАЗІЛІЮ, ПАРАГВАЙ, УРУГВАЙ (1918–1939 ГГ.)

У артыкуле аналізуецца інтэнсіўнасць беларускай эміграцыйнай хвалі ў Бразілію, Парагвай, Уругвай у міжваенны перыяд. Сусветны эканамічны крызіс аказаў негатыўны ўплыў на маштабы эміграцыі. Найлепшым кан'юнктурным момантам для эміграцыі ў Бразілію сталі 1920-я гг. Асноўным экспартным прадуктам Бразіліі была кава, таму значная частка беларускіх эмігрантаў атрымала працу на кававых плантацыях. Парагвай адрозніваўся найбольш ліберальным эміграцыйным заканадаўствам сярод краін Лацінскай Амерыкі. Неспрыяльным перыядам для эміграцыі ў Парагвай стала Чакская вайна. Уругвай быў альтэрнатыўнай краінай для тых, хто не змог выехаць у Аргенціну ці Бразілію. Эканамічныя беларускія эмігранты не мелі арганізацыйнага вопыту, таму іх грамадская і палітычная актыўнасць была невысокай. Сваёй актыўнай грамадскай працай вызначыліся Беларуска-ўкраінская рабочая арганізацыя «Асвета» (Бразілія) і Культурны цэнтр імя Т. Шаўчэнкі (Уругвай). Міжваенная эміграцыйная хваля складалася з жыхароў Заходняй Беларусі, якая з 1921 па 1939 гг. была ў складзе Польшчы. Эміграцыйныя працэсы ў Польшчы і маштабы эміграцыі беларусаў кантралявалі Эміграцыйнае ўпраўленне, Міністэрства працы і сацыяльнага забеспячэння, Эміграцыйны сіндыкат, Міністэрства замежных спраў.

**Ключавыя словы:** беларуская дыяспара, беларуская эміграцыя, эміграцыйная хваля, Бразілія, Парагвай, Уругвай, сусветны эканамічны крызіс.

**Для цытавання:** Коваль В. У. Эканамічная эміграцыя беларусаў у Бразілію, Парагвай, Уругвай (1918–1939 гг.) // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2021. № 2 (251). С. 24–28.

**V. U. Koval**
Belarusian State Technological University

# THE ECONOMIC EMIGRATION OF THE BELARUSIANS TO BRAZIL, PARAGUAY, URUGUAY (1918–1939)

The article analyzes the intensity of the Belarusian emigration wave to Brazil, Paraguay, Uruguay during the interwar period. The world economic crisis had the negative impact on the emigration scale. The best time for the emigration to Brazil was the 1920s. The main export product of Brazil was coffee, so many Belarusian emigrants worked at the coffee plantations. Paraguay has had the most liberal emigration laws among Latin American countries. The Chaco War was an unfavorable period for the emigration to Paraguay. Uruguay became the alternative country for those emigrants who were unable to enter Argentina and Brazil. The economic Belarusian emigrants didn't have the organizational experience, so their social and political activity was weak. The Belarusian-Ukrainian labor organization "Asveta" (Brazil) and the Cultural Center named after T. Shevchenko (Uruguay) carried out the active social work. During the interwar period the emigration wave consisted of the population of Western Belarus as a part of Poland from 1921 to 1939. The Emigration bureau, Ministry of Labor and Social Protection, the Emigration syndicate, Ministry of Foreign Affairs controlled the intensity of the emigration processes in Poland and the scale of the Belarusian emigration.

**Key words:** Belarusian diaspora, Belarusian emigration, emigration wave, Brazil, Paraguay, Uruguay, world economic crisis.

**For citation:** Koval V. U. The economic emigration of the Belarusians to Brazil, Paraguay, Uruguay (1918–1939). *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy,* 2021, no. 2 (251), pp. 24–28 (In Belarusian).

**Уводзіны.** Даследчыкі гісторыі беларускага замежжа пры аналізе эміграцыйнай міжваеннай хвалі ў краіны Лацінскай Амерыкі значную ўвагу надаюць Аргенціне, што абумоўлена там дзейнасцю самай колькаснай і актыўнай нацыянальнай дыяспары. Фактычна па-за ўвагай спецыялістаў застаюцца дыяспаральныя працэсы ў Бразіліі, Парагваі і Уругваі. Асноўнай мэтай даследавання з'яўляецца вывучэнне і аналіз эміграцыйнай міжваеннай хвалі беларусаў у такія атлантычныя рэспублікі, як Бразілія, Парагвай і Уругвай.

**Асноўная частка.** Для фарміравання масавай эміграцыйнай хвалі выключнае значэнне

мела палітыка краін-рэцыпіентаў, якая аказвала непасрэдны ўплыў на інтэнсіўнасць руху, фарміравала геаграфічны накірунак і рэгулявала сацыяльны склад эмігрантаў. Краіны Лацінскай Амерыкі вылучаліся адносна ліберальным эміграцыйным заканадаўствам. Высокія кошты на карабельныя квіткі абмяжоўвалі рост эканамічнай хвалі эміграцыі з Еўропы, аднак магчымасці атрымаць крэдыт на падарожжа і рэклама агентаў мараплаўных кампаній стымулявалі эміграцыю.

Асноўная маса беларускіх эмігрантаў у міжваенны перыяд была жыхарамі Заходняй Беларусі, якая з 1921 па 1939 гг. уваходзіла ў склад Другой Рэчы Паспалітай. Маштабы эміграцыйнай хвалі ў краіны Лацінскай Амерыкі як айчынныя, так і замежныя даследчыкі вызначаюць недакладна. Складана вылучыць колькасць беларускіх эмігрантаў у агульнай эміграцыйнай хвалі, бо асобы мелі афіцыйныя польскія дакументы. Беларускія эмігранты паходзілі з тэрыторыі Віленскага, Беластоцкага, Навагрудскага і Палескага ваяводстваў. Большасць беларусаў былі праваслаўнымі. Польскія статыстычныя крыніцы дазваляюць рабіць аналіз эміграцыйнага руху, абапіраючыся ў асноўным на веравызнанне эмігрантаў.

Дзяржаўны апарат Другой Рэчы Паспалітай імкнуўся кантраляваць інтэнсіўнасць эміграцыйнай хвалі. Пытаннямі эміграцыі непасрэдна займаліся Міністэрства працы і сацыяльнага забеспячэння і Міністэрства замежных спраў. Асноўным дзяржаўным органам эміграцыйнага апарату стала Эміграцыйнае ўпраўленне пры Міністэрстве працы і сацыяльнага забеспячэння, створанае ў красавіку 1920 г. распараджэннем Кабінета міністраў [1, с. 114]. Эміграцыйнае ўпраўленне ажыццяўляла кантроль над рэкрутацыяй асоб, аналізавала эміграцыйную кан'юнктуру, рыхтавала распараджэнні пра ўмовы эміграцыі, аказвала дапамогу эмігрантам у час падарожжа, вырашала праблемы рээміграцыі.

У 1930-я гг. была праведзена рэарганізацыя дзяржаўных органаў, якія займаліся пытаннямі эміграцыі. Для аналізу і кантролю маштабаў перасяленняў была створана Міжміністэрская эміграцыйная камісія, дзе рашаючы голас мелі прадстаўнікі Міністэрства замежных спраў. Эміграцыйны сіндыкат фактычна манапалізаваў рэкрутацыю эмігрантаў у 1930-я гг. Сіндыкат з'яўляўся таварыствам з абмежаванай адказнасцю, асноўнымі задачамі якога былі інфармаванне насельніцтва пра ўмовы эміграцыі, аказанне дапамогі пры афармленні неабходных дакументаў, уладжванне фармальнасцяў, звязаных з выездам, дапамога эмігрантам у час падарожжа [1, с. 115]. Таварыства было зацікаўлена ў пашырэнні маштабаў эміграцыі ў краіны Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі, бо сіндыкат атрымоўваў значныя прыбыткі ад продажу карабельных карт.

Краіны Лацінскай Амерыкі імкнуліся праводзіць адбор эмігрантаў з Еўропы. Крытэрыі адбору дакладна пазначаліся ў законе «Аб эміграцыі» і законе «Аб замежніках», дзе падкрэслівалася, што «непажаданымі замежнікамі» з'яўляюцца эмігранты, старэйшыя за 60 год, асобы з крымінальным мінулым, без сродкаў на існаванне, без прафесіі, інваліды і г. д. [2, с. 54]. На падобную эміграцыйную заканадаўчую базу абапіралася Бразілія і Уругвай.

Бразільскі ўрад стымуляваў еўрапейскую эміграцыю з мэтай паслаблення эканамічнага і палітычнага панавання партугальскага элемента ў дзяржаве. У 1920-я гг. выдаваліся субсідыі для эмігрантаў пры ўмове выплаты сум з будучых заробкаў. На востраве Кветак у Рыа-дэ-Жанейра ў першыя дні знаходжання ў Бразіліі эмігрантаў бясплатна кармілі. Беларусы кампактна пражывалі ў штатах Парана, Рыу-Гранды-ду-Сул, Рыа-дэ-Жанэйра, Санта-Катарына, Мінас-Жэрайс, Сан-Паулу.

Польскі гісторык Е. Мазурэк ацэньвае эміграцыйную хвалю ў Бразілію міжваеннага дваццацігоддзя ў памеры 41 тыс. чалавек [3, с. 63]. Можна выказаць меркаванне, што прыблізна чвэрць ад агульнай лічбы складалі беларусы. Беларуская даследчыца В. М. Мярчук лічыць, што з 1926 па 1938 гг. у Бразілію выехала 6480 чалавек з тэрыторыі Беластоцкага, Віленскага, Навагрудскага і Палескага ваяводстваў [4, с. 56]. Колькасныя ацэнкі маштабаў эміграцыі маюць недакладны характар, аднак фактычна ўсе беларускія эмігранты перасяляліся ў Бразілію па эканамічных прычынах.

Асноўным экспартным прадуктам Бразіліі была кава. Эканамічнае панаванне штата Сан-Паулу тлумачылася дамінуючымі пазіцыямі вытворцаў кавы ў краіне. Эканоміка Бразіліі фактычна была монакультурнай, бо нацыянальнымі галінамі стала вытворчасць кавы і здабыча мінералаў. Любыя змены коштаў на каву адразу адлюстроўваліся на Бразіліі, у 1920-я гг. назіралася відавочная залежнасць дзяржавы ад экспарту. У штаце Сан-Паулу па прычыне недахопу рабочых рук на плантацыях кавы ўпершыню пачалі шырока рэалізоўваць праграму фінансавання карабельных квіткоў з Еўропы ў Бразілію, што значна актывізавала эміграцыю.

Сусветны эканамічны крызіс моцна закрануў Бразілію па прычыне катастрафічнага скарачэння попыту на каву. Нягледзячы на падзенне коштаў, вытворцы кавы працягнулі пашыраць плошчы культуры. Гэта сітуацыя прывяла да велізарных лішкаў кавы. Бразільскі ўрад, каб выратаваць сваю эканоміку, прымусіў вытворцаў ліквідаваць празмернасць кавы. Больш за 80 млн. мяшкоў кавы было спалена і выкінута ў акіян, што ў 2 разы перавышала яе сусветнае

ўжыванне [5, с. 2]. Беларуская віленская прэса жыва адгукнулася на факты знішчэння кавы ў Бразіліі: «А тое масавае паленьне кавы, кукурузы, цукру на вялізарных плянтацыях прамысловых “каралёў” Паўдзённай Амэрыкі, якое адбываецца штогодна, каб … ня зьнізіць цэнаў на гэтыя вырабы, усе гэта зьявішча таго-ж парадку» [6, с. 5]. Абурэнне сялян ў прэсе ў дачыненні бразільскага ўраду было шчырым. Яны не разумелі, што палітыка выратавання кававай справы стрымлівала развіццё прамысловасці, лясной гаспадаркі, жывёлагадоўлі Бразіліі. Глыбокае расчараванне беларускіх эмігрантаў, якія займаліся апрацоўкай кававых плантацый, аказала негатыўны ўплыў на іх эмацыянальны стан у перыяд сацыяльна-псіхалагічнай адаптацыі.

Найлепшым кан’юнктурным момантам для міжваеннай эміграцыі ў Бразілію сталі 1920-я гг. Пікавы перыяд росту колькасці эмігрантаў ў Бразілію быў з 1924 па 1929 гг. Асаблівасцю эканамічнай эміграцыйнай хвалі ў Бразілію было тое, што ўрад стымуляваў пераезд у краіну сем’ямі. Падлеткі мелі права працаваць на плантацыях кавы з 13-гадовага ўзросту. Большасць беларусаў у Бразіліі былі сельскагаспадарчымі работнікамі. Сяляне не маглі вырошчваць традыцыйныя еўрапейскія культуры ва ўмовах субтропікаў. Жыта і пшаніцу ў Бразіліі знішчаў збожжавы шкоднік (даўганосік). Беларусы былі вымушаны пераарыентавацца на вырошчванне мясцовых сельскагаспадарчых культур: рыс, чорная фасоля, маніёк і інш.

Сусветны эканамічны крызіс прывёў да крушэння знешніх рынкаў збыту, да сацыяльнай напружанасці, выкліканай высокім беспрацоўем. Рэформы ўраду Ж. Варгаса ў 1930-я гг. дазволілі паставіць пад кантроль кававую алігархію краіны. Улады Бразіліі на заканадаўчым узроўні пачалі стрымліваць эміграцыю. 14 снежня 1930 г. Бразілія забараніла высадку ў сваіх партах пасажыраў III класа, якія не мелі ні кантракта, ні запрашэння да бліжэйшых сваякоў, ні дамовы з пэўным каланізацыйным таварыствам [7, с. 386]. У 1934 г. парламент Бразіліі ўвёў максімальныя гадавыя квоты для эмігрантаў розных нацый (па прыкладу заканадаўства ЗША). У 1936 г. быў уведзены эміграцыйны закон, які прадугледжваў гадавыя квоты ў памеры 2% ад колькасці эмігрантаў з пэўнай краіны за папярэдняе 50-годдзе (для Польшчы квота склала каля 2000 чалавек у год, а ў 1938 г. квоту паменшылі да 1230 чалавек) [8, с. 136]. Увядзенне квот значна скараціла маштабы эканамічнай эміграцыі з Польшчы.

Масавая эміграцыя ў Парагвай з тэрыторыі Другой Рэчы Паспалітай пачалася ў канцы 1920-х гг. Парагвай адрозніваўся самым ліберальным эміграцыйным заканадаўствам сярод краін Лацінскай Амерыкі. Нягледзячы на тое, што прыбыткі ў сельскай гаспадарцы былі невысокімі, урад фактычна не ўводзіў абмежаванняў для эмігрантаў. Пра пачатак эміграцыйнай хвалі ў Парагвай сучасны польскі гісторык Е. Мазурэк піша наступнае: «Гэта былі невялікія групы, акрамя таго, большасць эмігрантаў з’яўлялася ўкраінцамі па нацыянальнасці з польскім грамадзянствам. Яны сяліліся, галоўным чынам, у калоніі Фрам, што займала тэрыторыю каля 70 тысяч гектараў ураджайнай зямлі, якую перасякала рака Такуары» [9, с. 108]. Эмігранты ў Парагваі кампактна рассяліліся ў дэпартаментах Каасапа і Альта-Парана, а таксама ў акрузе горада Энкарнасьон, які знаходзіцца на рацэ Парана каля парагвайска-аргеніцскай мяжы.

Е. Мазурэк у сваёй манаграфіі пры аналізе эканамічнай эміграцыі ў Парагвай пазначае: «Малы статыстычны штогоднік сведчыць, што з Польшчы ў Парагвай з 1927 па 1938 г. выехала болей за 12 000 чалавек, з якіх сваё праваслаўнае веравызнанне задэкларавала 8.800 чалавек, што складае 73,4% ад агульнай лічбы эмігрантаў» [9, с. 109]. Большасць праваслаўных эмігрантаў былі беларусамі і ўкраінцамі з тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Можна зрабіць выснову, што асноўную частку эміграцыйнай міжваеннай хвалі ў Парагвай складаў няпольскі элемент.

Адметнасцю эміграцыі ў Парагвай у 1930-я гг. стаў неспрыяльны кан’юнктурны момант, звязаны з Чакскай вайной. З 1932 г. Парагвай удзельнічаў у ваенных дзеяннях з Балівіяй за вобласць Чака. Нягледзячы на тое, што перамір’е было заключана ў чэрвені 1935 г., баявыя дзеянні працягваліся да 1936 г. У перыяд вайны спыніўся масавы рух эканамічных эмігрантаў у Парагвай, аднак яны востра спатрэбіліся дзяржаве для аднаўлення эканомікі ў пасляваенны час. Урад разлічваў, што патэнцыяльны працоўны рэсурс з ліку эмігрантаў паспрыяе гаспадарчаму аднаўленню, таму 16 лістапада 1936 г. быў прыняты дэкрэт, згодна якому эмігранты з Польшчы атрымалі грамадскія правы, а таксама шэраг іншых палёгак, сярод якіх вызваленне ад зямельнага падатку тэрмінам на 5 год [9, с. 108]. Эмігранты ў Парагваі таксама мелі права на бясплатнае медыцынскае абслугоўванне і магчымасць адукацыі на роднай мове, таму ў калоніях перасяленцаў ствараліся нацыянальныя школы.

У канцы 1930-х гг. эмігранты пагаджаліся ехаць у Парагвай таму, што не мелі магчымасці перасяліцца ў іншыя краіны Лацінскай Амерыкі. Агенты карабельных кампаній разумелі сітуацыю, таму лёгка давалі сялянам нерэальныя абяцанні пра бясплатнае харчаванне ў Парагваі і высокія заробкі. Першапачатковая сацыяльна-псіхалагічная адаптацыя эмігрантаў праходзіла складана па прычыне пачуцця расчаравання

ўмовамі пражывання ў Парагваі. Успаміны эмігрантаў сведчаць наступнае: «У Парагваі ім выдзелілі вялізную колькасць зямлі, кажучы: “Бярыце, мачэце, колькі зможаце вырубіць, уся зямля будзе ваша”. Яны знайшлі тых людзей, выявы якіх былі на агітацыйных фатаграфіях. І выявілася, што гэтыя людзі жылі ў бядноце, а за фатаграфаванне ім паабяцалі шмат грошай» [10, с. 8]. Сялянам было складана падстройвацца пад новую сістэму вядзення сельскай гаспадаркі ў іншых кліматычных умовах.

Эмігранты ехалі ва Уругвай у 1920-я гг., калі можна было ўладкавацца ў харчовай прамысловасці ці на будоўлі. У 1930-я гг. прырост калоній быў абумоўлены як натуральным дэмаграфічным фактарам, так і перасяленнем некаторых асоб з іншых краін Лацінскай Амерыкі. Эміграцыя ва Уругвай не стала пашыранай сярод жыхароў Другой Рэчы Паспалітай па прычыне невысокай аплаты працы. Уругвай быў альтэрнатыўнай краінай для тых, хто не здолеў выехаць у Аргенціну ці Бразілію, аднак пры першай жа магчымасці асобы імкнуліся туды перасяліцца.

Эканамічныя эмігранты не мелі вопыту арганізацыйнай працы, чым можна патлумачыць іх слабую грамадскую дзейнасць у Бразіліі, Парагваі і Уругваі. Адной з асноўных гістарычных крыніц пра мерапрыемствы беларускіх эмігранцкіх арганізацый стала міжваенная перыёдыка. На старонках газет і часопісаў вельмі рэдка публікаваўся матэрыял пра дзейнасць беларусаў у краінах Лацінскай Амерыкі.

Пра нацыянальную супольнасць у Бразіліі прэса пачала пісаць з нагоды палітычнай справы і вынясення прысуду над Б. Тарашкевічам. Беларускамоўная газета ў Берліне «Барацьба» (1933, № 2) акрэсліла пазіцыю Цэнтральнага камітэта беларуска-ўкраінскай рабочай арганізацыі «Асвета», якая дзейнічала ў г. Порту-Алегры (Бразілія), наступным чынам: «Мы Беларусы і Украінцы, згуртаваныя каля свае работніцкай арганізацыі “Асьвета” ў Порто Алегре энергічна пратэстуем процiў новай судовай камедыі над правадыром беларускіх працоўных мас і над арганізатарам беларускай стотысячнай арганізацыі “Грамады” – Б. Тарашкевічам» [11]. На матэрыял беларусаў у Германіі хутка адгукнулася віленская прэса, газета «Родны край» апублікавала інфармацыю: «Сярод беларускае работніцкае эміграцыі, згуртаванае ў Портэ-Алегрэ пры таварыстве “Асьвета”, прысуд над Тарашкевічам выклікае усхваляваньне, што, як падае бэрлінская “Барацьба”, выявілася ў адпаведнай рэзалюцыі» [12, с. 6]. Газетныя нататкі не толькі зафіксавалі палітычную актыўнасць беларускіх эмігрантаў у г. Порту-Алегры, але і прадэманстравалі ўзаемасувязі беларускай дыяспары Бразіліі з беларусамі Германіі, а таксама рэгулярныя кантакты эмігрантаў з метраполіяй.

Арганізацыя «Асвета» ў Бразіліі была міжнароднай, аснову яе складалі беларусы і ўкраінцы. Падобная практыка грамадскіх аб’яднанняў была дастаткова распаўсюджанай для краін Лацінскай Амерыкі. Вядучая расійская даследчыца гісторыі эміграцыі ў лацінаамерыканскіх краінах М. М. Масейкіна ў сваёй манаграфіі ўзгадвае пра Культурны цэнтр імя Т. Шаўчэнкі, створаны ў 1927 г. у г. Монтэвідэа, які шырока супрацоўнічаў з савецкім пасольствам ва Уругваі [13, с. 131]. Цэнтр таксама ўяўляў сабой міжнародны праект, арганізацыяй яго дзейнасці займаліся рускія, украінцы і беларусы ва Уругваі.

**Заключэнне.** Такім чынам, у міжваенны перыяд былі створаны польскія дзяржаўныя органы, якія ажыццяўлялі кантроль за эміграцыйнымі працэсамі з тэрыторыі Заходняй Беларусі. Большасць беларусаў у Бразіліі і Парагваі былі сельскагаспадарчымі работнікамі, а эмігранты ва Уругваі імкнуліся ўладкавацца ў прамысловасці. Сусветны эканамічны крызіс прымусіў урады лацінаамерыканскіх краін на заканадаўчым узроўні абмежаваць эміграцыю. Палітычная актыўнасць беларусаў у Бразіліі, Парагваі і Уругваі была слабой, пра што сведчыць міжваенная перыёдыка.

## Спіс літаратуры

1. Reczyńska A. Emigracja z Polski do Kanady w okresie międzywojennym. Wrocław [etc.]: Wydawnictwo Polskiej Akademii Nauk, 1986. 223 s.

2. Schwarz T. Políticas de inmigración en América Latina: el extranjero indeseable en las normas nacionales, de la Independencia hasta los años de 1930 // Procesos. Revista Ecuatoriana de Historia. 2012. № 36. P. 39–72.

3. Mazurek J. Kraj a emigracja. Ruch ludowy wobec wychodźstwa chłopskiego do krajów Ameryki Łacińskiej (do 1939 roku). Warszawa: Instytut Studiów Iberyjskich i Iberoamerikańskich Uniwersytetu Warszawskiego, 2006. 528 s.

4. Мярчук В. М. Эканамічная эміграцыя заходнебеларускага насельніцтва ў Бразілію ў 1921–1939 гг. // Веснік Брэсцкага універсітэта. 2013. № 1. С. 52–64.

5. Zappino J. S. Inmigracion y origenes de la industrializacion en Brasil 1870–1954 // ResearchGate. December 2009. URL: https://www.researchgate.net/publication/334573531 (дата обращения: 14.05.2021).

6. Калі і хто зрабіў найкарысьнейшыя вынаходы // Родны край. 1933. № 1. С. 5.

7. Janowska H. Emigracja z Polski w latach 1918–1939 // Emigracja z ziem polskich w czasach nowożytnych i najnowszuch (XVIII–XX w.). Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1984. S. 326–450.

8. Brożek A. Polityka imigracyjna w państwach docelowych emigracji polskiej (1850–1939) // Emigracja z ziem polskich w czasach nowożytnych i najnowszuch (XVIII–XX w.). Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1984. S. 120–140.

9. Mazurek J. Kraj a emigracja. Ruch ludowy wobec wychodźstwa chłopskiego do krajów Ameryki Łacińskiej (do 1939 roku). Warszawa: Instytut Studiów Iberyjskich i Iberoamerikańskich Uniwersytetu Warszawskiego, 2006. 528 s.

10. Шабельцев С. В. Иммигранты-чакареро из II Речи Посполитой в Аргентине и Парагвае. Воспоминания белорусов и украинцев. Минск: РИВШ, 2011. 94 с.

11. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Фонд 458. Воп. 1. Спр. 182. Арк. 9 зв.

12. У Бразіліі // Родны край. 1933. № 6. С. 6.

13. Мосейкина М. Н. «Рассеяны, но не расторгнуты»: русская эмиграция в странах Латинской Америки в 1920–1960 гг. М.: РУДН, 2011. 384 с.

## References

1. Rechynska A. *Emigracja z Polski do Kanady w okresie międzywojennym* [The emigration from Poland to Canada during the interwar period]. Wroclaw [etc.], Polish Academy of Sciences Publ., 1986. 223 p.

2. Schwarz T. Emigration policy of Latin America: the unwanted foreigner for the nation, from the independence to the 1930s. *Procesos. Revista Ecuatoriana de Historia* [Processes. Ecuadorian History Journal], 2012, no. 36, pp. 39–72 (In Spanish).

3. Mazurek J. *Kraj a emigracja. Ruch ludowy wobec wychodźstwa chłopskiego do krajów Ameryki Łacińskiej (do 1939 roku)* [State and emigration. The national movement and the peasant emigration to Latin American countries (before 1939)]. Warsaw, Institute of Iberian and Iberoamerican Studies Publ., 2006. 528 p.

4. Miarchuk V. M. The economic emigration of the West Belarusian population to Brazil in 1921–1939. *Vesnik Brestskaga universiteta* [Bulletin of the Brest University], 2013, no. 1, pp. 52–64 (In Belarusian).

5. Schwarz T. Emigration policy of Latin America: the unwanted foreigner for the nation, from the independence to the 1930s. *Procesos. Revista Ecuatoriana de Historia* [Processes. Ecuadorian History Journal], 2012, no. 36, pp. 39–72 (In Spanish).

6. When and who made the most important discoveries. *Rodnyi kray* [The Native Land], 1933, no. 1, p. 5 (In Belarusian).

7. Janovska H. Emigration from Poland in the years 1918–1939. *Emigracja z ziem polskich w czasach nowożytnych i najnowszuch (XVIII–XX w.)* [The emigration from Polish territories during the modern and contemporary times (since 18th century until 20th century)]. Warsaw, State Scientific Publ., 1984, pp. 326–450 (In Polish).

8. Brozek A. The immigrational policy in the target countries of Polish emigration (1850–1939). *Emigracja z ziem polskich w czasach nowożytnych i najnowszuch (XVIII–XX w.)* [The emigration from Polish territories during the modern and contemporary times (since 18th century until 20th century). Warsaw, State Scientific Publ., 1984, pp. 120–140 (In Polish).

9. Mazurek J. *Kraj a emigracja. Ruch ludowy wobec wychodźstwa chłopskiego do krajów Ameryki Łacińskiej (do 1939 roku)* [State and emigration. The national movement and the peasant emigration to Latin American countries (before 1939)]. Warsaw, Institute of Iberian and Iberoamerican Studies Publ., 2006. 528 p.

10. Shabelcev S. V. *Immigranty-chakarero iz II Rechi Pospolitoy v Argentine i Paragvaye. Vospominaniya belorusov i ukraintsev* [Chacarero immigrants from the Polish-Lithuanian Commonwealth in Argentina and Paraguay. Memoirs of the Belarusians and the Ukrainians]. Minsk, RIHS Publ., 2011. 94 p.

11. National Archives of the Republic of Belarus. Fund 458. I. 1. F. 182. L. 9.

12. In Brazil. *Rodnyi kray* [The Native Land], 1933, no. 6, p. 6 (In Belarusian).

13. Moseikina M. N. “*Rasseyany no ne rastorgnuty”: russkaya emigratsiya v stranakh Latinskoy Ameriki* [“Dispersed but not disunited”: Russian emigration in Latin America]. Moscow, PUFR Publ., 2011. 384 p.

## Інфармацыя пра аўтара

**Коваль Вольга Уладзіміраўна** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: koval@belstu.by

## Information about the author

**Koval Volha Uladzimirauna** – PhD (History), Associate Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., Minsk, Republic of Belarus). E-mail: koval@belstu.by

*Паступ
іў 06.09.2021*